Мельнік І.У.,
канд.пед.навук,
дацэнт
Самайлюк Т.А.,
аспірантка

# МЕСЦА БАГАСЛОЎСКІХ ВЕДАЎ У ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ БІБЛІЯТЭКАРАЎ ВА ЎМОВАХ НАВУЧАННЯ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

Гісторыя свету, у якім мы жывём, -- гэта гісторыя хрысціянскага славянскага свету. У выніку сямідзесяцігадовых рэпрэсій сферы царкоўна-рэлігійнага жыцця перарвалася сувязь хрысціянскіх традыцый.

Бібліятэкары як пасрэднікі ў распаўсюджванні пэўнай культуры прафесійна складваюцца ва ўмовах адпаведных духоўных і педагагічных традыцый. Якія яны зараз, гэтыя традыцыі? І якімі яны павінны быць ва універсітэце культуры?

У Канцэпцыі развіцця бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь афіцыйна прызнана правамернасць існавання спецыялізаванай сеткі царкоўных бібліятэк. І гэтая сетка адраджаецца. У царкоўных бібліятэках ужо працуюць прафесійныя бібліятэкары, якім блізка гэтая сфера па свайму духу. Напрыклад, бібліятэку Мінскай духоўнай семінарыі вядзе выпускніца бібліятэчнага тэхнікума, якая прыняла манаства; у бібліятэцы сабора св.Пятра і Паўла па сумяшчальніцтву працуе супрацоўніца адной з рэспубліканскіх бібліятэк і г.д. Зараз адчуваецца патрэбнасць у падрыхтоўцы кадраў для гэтай сеткі бібліятэк і ў сувязях цэнтраў падрыхтоўкі бібліятэкараў з царкоўнымі бібліятэкамі, духоўнымі вучэбнымі і грамадскімі арганізацыямі і ўстановамі. У 1993 г. упершыню студэнткі II курса праходзілі вытворчую практыку ў бібліятэцы Мінскага Епархіяльнага ўпраўлення (МЕУ). Супрацоўнікам бібліятэкі МЕУ - студэнтам нашага універсітэта- упершыню выканана дыпломная работа на тэму "Царкоўна-рэлігійная літаратура і яе адлюстраванне ў бібліятэках г.Мінска (на прыкладзе права-слаўнай літаратуры)". Адбыліся першыя ка-мандзіроўкі ў праваслаўныя манастыры і вучэбныя ўстановы ў ходзе кнігазнаўчых і бібліятэчна-бібліяграфічных даследаванняў.

У свецкіх бібліятэках вопыт мінулага вельмі добра адчуваюць бібліятэкары, якія атрымалі атэістычную адукацыю і выхаванне ў духу ідалапаклонства партыйна-дзяржаўным лідэрам. Ведаў у галіне багаслоўя, вопыту царкоўнага жыцця ў бібліятэкараў, за пэўным выключэннем, не было. Спецыфічныя і ўмовы бібліятэчнай працы: знаходжанне кожны дзень пэўны час у акружэнні кніг, уздзеянне якіх далёка не нейтральна. Да атэістычна-багаборніцкай інфармацыі прыбавіўся мутны паток кніг па містыцы, акультызму, чараўніцтву і інш. Пашыраецца практыка пакланення тварнаму. (Аб гэтых аспектах глядзі: Роуз С. Будущее России и конец мира. Православное мировоззрение. НЛО в свете Православной Веры. М., 1992; См. особенно "Дух научной фантастики". С.35-40; Родион свящ. Люди и демоны. СПб., 1993. Пры напісанні гэтай кнігі выкарыстана шмат багаслоўскіх прац і прац свецкіх аўтараў, усяго каля 150 назваў.) Агульнавядомы факты і эксперыменты аб негатыўным уздзеянні на падсвядомасць людзей праз падключэнне да сродкаў камунікацыі.

У дадзеным паведамленні раскрываецца першы вопыт увядзення багаслоўскіх аспектаў у выкладанне спецыяльнай дысцыпліны на факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

Багаслоўская інфармацыя -- састаўная частка сацыяльнай інфармацыі. Першыя публікацыі аб цэнтрах абслугоўвання чытачоў у царкоўна-рэлігійнай сферы былі ўведзены ў курс "Бібліяграфія грамадска-палітычнай літаратуры". На дзелавых гульнях выявілася неабходнасць у непасрэдным знаёмстве з гэтай літаратурай. На першыя агляды выданні прыносілі самі студэнты. З арганізацыяй у бібліятэцы універсітэта аддзела рэдкай кнігі, куды ўваходзяць і крыніцы па багаслоўю ў выданнях розных стагоддзяў, з'явілася магчымасць выкарыстоўвання гэтага старажытнага комплексу выданняў для вучэбна-навуковых мэтаў па шмат якіх дысцыплінах (гісторыі кнігі, грамадска-палітычнай, краязнаўчай, беларускай бібліяграфіі, гісторыі бібліятэчнай справы, гісторыі рэлігіі, этнаграфіі і інш.).

Крыніцазнаўчую аснову багаслоўскіх навук, багаслоўскіх вучэбных дысцыплін, практыкі праваслаўнай царквы складаюць: Свяшчэннае пісанне; дзеянія і пасланні святых апосталаў; пастанаўленні Усяленскіх сабораў; тварэнні св.Айцоў, жыцці святых; богаслужэбныя кнігі. Веданне гэтых груп крыніц неабходна пры стварэнні ўсіх відаў ІПС.

У 1993/94 навучальным годзе быў уведзены курс па выбару "Бібліятэчна-бібліяграфічная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

работа з царкоўна-рэлігійнай літаратурай (на прыкладзе праваслаўных выданняў)". Яго прачытаў выкладчык Мінскай духоўнай семінарыі, настаяцель Свята-Пятра-Паўлаўскага сабора протаіерэй Георгій Латушка. Так быў рэалізаваны ў прымяненні да гэтай сферы прынцып выкарыстоўвання спецыялістаў. У складзе курса была прадстаўлена і тэма "Выданне і бытаванне праваслаўнай літаратуры на Беларусі" і аб свяціцелях Зямлі Беларускай.

Сутыкненне з гэтай інфармацыяй нечакана дапамагло (студэнтам, бібліятэкарам, выкладчыкам) выявіць хваравітасць сваёй душы: затарможанасць, зніжэнне здольнасці да асваення ведаў; страх, у тым ліку страх смерці; з'яўленне думак аб самазабойстве, стан "жыць не хочацца"; злоснасць, агрэсіўнасць. Характэрна, што гэта праяўлялася ў прайшоўшых па шляху пошукаў праз розныя ўсходнія і астралагічныя школы, у тых, хто надарваўся у нястрыманым служэнні "мамоне". У гэтых выпадках праяўлялася патрэбнасць ў атрыманні не толькі асветнай багаслоўскай інфармацыі, але і ў кваліфікаванай парадзе аб царкоўна-рэлігійным жыцці, у рэальнай жыватворчай дапамозе царквы.

Раскрыццё будучым бібліятэкарам асноў багаслоўскіх ведаў, сумежных са спецыяльнымі ведамі ў сапраўдным, нескажоным выглядзе, дазволіць арганізаваць іх навучанне ў духу лепшых універсітэцкіх традыцый мінулага. З аднаго боку -- гэта шлях да прафесійнай арыентацыі бібліятэкараў ва ўсім комплексе інфармацыі, з другога -- стварэнне ўмоў для свядомай рэалізацыі моладдзю свайго права выбару ў духоўнай галіне ў адпаведнасці са свабоднай воляй.

Шабельнік Т.В.,
выкладчык

## БІБЛІЯТЭКАР БІБЛІЯТЭК УНІВЕРСІТЭТА І КАЛЕДЖА: ЯКІМ ЁН ПАВІНЕН БЫЦЬ
(погляд амерыканскіх бібліятэказнаўцаў)

У сувязі з эканамічнымі і палітычнымі зменамі, якія адбываюцца ў нашай рэспубліцы, павялічваецца значнасць вышэйшых навучальных устаноў. Эфектыўная дзейнасць любой навучальнай установы непарыўна звязана з дзейнасцю і якасцю працы бібліятэкі і бібліятэкара. У сваю чаргу якасць працы любой бібліятэкі залежыць ад якасці падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў.

На погляд амерыканскіх бібліятэказнаўцаў, галоўныя фактары, якія ўплываюць на вышэйшую адукацыю, -- гэта эрудыцыя, тэхналогія і эканоміка, якія ўзаемазвязаны. Першачарговая мэта універсітэцкіх навуковых бібліятэк -- арганізацыя і забеспячэнне доступу да інфармацыі -- не будзе змяняцца, у той жа час формы і метады значна мяняюцца, забяспечваючы новыя магчымасці.

Амерыканскія бібліятэчныя дзеячы, такія як Бацін, Поўэл, Крэс, Хоандлей, вызначылі наступныя рысы, уласцівыя бібліятэкару універсітэцкай бібліятэкі:

- цвердая навуковая падрыхтоўка з крытычным поглядам;
- здольнасць думаць і знаходзіць прычынную сувязь;
- здольнасць вырашаць розныя праблемы;
- веданне аперацый і прынцыпаў функцыяніравання бібліятэкі;
- здольнасць да камунікабельнасці.

Прызначэнне бібліятэк каледжаў у ЗША значна адрозніваецца ад прызначэння універсітэцкіх бібліятэк. Універсітэцкія бібліятэкі абслугоўваюць розныя катэгорыі чытачоў, садзейнічаюць навуковым даследаванням. Іх фонд ствараецца зыходзячы з патрэбаў вучоных і студэнтаў. Прызначэнне бібліятэк каледжаў -- абслугоўванне ў першу чаргу выпускнікоў і садзеянне навучальнаму працэсу.

Прааналізаваўшы некалькі пунктаў погляду дырэктара ў амерыканскіх універсітэцкіх бібліятэк, такіх як Моўрэр, Долард, Мафет, можна вызначыць наступныя патрабаванні да бібліятэкара:

- павінен быць высокаэрудыраваным чалавекам, энцыклапедыстам;
- гэта чалавек, праца якога грунтуецца на навуковай аснове;
- бібліятэкару неабходна ведаць і прызнаваць місію вышэйшай адукацыі, разбірацца ва ўзаемаадносінах, а таксама працаваць больш цесна са студэнтамі ў якасці навуковага і інфармацыйнага дарадчыка;
- для больш эфектыўнай працы з выкладчыцкім саставам і студэнтамі бібліятэкар павінен ведаць і падтрымліваць іх інтарэсы;
- яму неабходна выконваць кіраўніцкую функцыю.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ